**О Беларусь, мая калыска,**
**Жыццё маё, прытулак мой!**

*Пятро Глебка.*

# МАЁЙ РАДЗІМЫ ДЗІЎНЫ СВЕТ



Правообладатель Национальный институт образования

## ЁН РАДЗІМАЮ ЗАВЕЦЦА — НЕПАЎТОРНЫ ГЭТЫ КРАЙ *(Міхась Пазнякоў)*



— Мы летам былі на радзіме маіх дзядулі і бабулі, — паведаміў Лянок. — Там так цудоўна, птушкі спяваюць, рэчка.

— А я, на жаль, ніколі не была на радзіме маіх продкаў, — сказала Васілінка.

— Шкада. Спадзяюся, што ты яшчэ там пабываеш і не аднойчы. Але я рады, што ўсе мы жывём у адной краіне — нашай роднай Беларусі.

Крыля́е — ляціць.
Квітне́е — становіцца прыгажэйшым.

Правообладатель Национальный институт образования

Што для вас значыць Радзіма? Прачытайце верш і скажыце, якой вы ўяўляеце Радзіму.

## Беларускі край

*Анатоль Зэкаў*

Над зямлёй крыля́е бусел.
Скачуць конікі ў траве.
Дзед жыве ў Беларусі,
І бабуля тут жыве.

Тут жывуць і тата з мамай,
Брацік мой, мая сястра.
Тут жыву і я такса́ма.
Беларусь — наш родны край.

Край лясоў, лугоў і рэчак,
Ён квітне́е з году ў год,
І на свеце будуць вечна
Край наш родны і народ.

1. Якія малюнкі беларускай прыроды можна ўявіць, калі чытаеш верш?
2. Хто са сваякоў прыгадваецца ў вершы? Прачытайце верш выразна.
3. Растлумачце сувязь паміж словамі: *родны, род, народ, Радзіма.*


Правообладатель Национальный институт образования

Ператвара́ецца — становіцца іншым.
Падхапі́ў — *рус.*: подхватил.
Спало́халася — *рус.*: испугалась.

Разгледзьце малюнкі. Што здарылася з Кропелькай? Чым скончылася яе падарожжа? Чаму гэта здарылася? Падумайце, калі будзеце чытаць твор.

## Кропелька

*Алена Кобец-Філімонава*

Жыла-была дажджавая Кропелька. Яна нястомна працавала. Ка́пне з хмары на зямлю. Напоіць яе. А потым вы́парыцца і зноў у паветра ўзля-ціць. Збяру́цца такія кропелькі ў адно воблака. Калі іх стане вельмі многа, воблака цямнее ад цяжа́ру, пе-ра-тва-ра-е-цца ў хма-ру. Усе кропелькі, не ўтры-ма́ў-шы-ся, па́-даюць уніз праліўны́м даждж ом.



Правообладатель Национальный институт образования

Аднойчы Кропелька не паспе́ла даляце́ць да зямлі. Яе падхапі́ў Паўночны Вецер. Пача́ў ён на-сві-стваць пра незвычайную казачную краіну, з якой прыляцеў. Пачаў упрошваць Кропельку кі́нуць родны кут і паляцець разам з ім. Згадзі́лася Кропелька.

Тады Паўночны Вецер сарва́ў з бярозы лісцік і панёс на ім Кропельку ў далёкі край.

Прыляцела Кропелька. І што ж?

Убачыла яна шэрае халоднае неба. І такое ж халоднае сонца. І такую ж халодную, заснежаную зямлю. Пачала Кропелька замярзаць. Яшчэ крыху — і стала б яна ледзяшом.



Спа-ло-ха-ла-ся Кропелька, што загі́не. Пачала прасіць Паўночны Вецер адне́сці яе назад на радзіму.

Зжаліўся Паўночны Вецер. Аднёс яе.



Правообладатель Национальный институт образования

Кропелька не магла дачака́цца, калі прызямліцца бярозавы лісцік. Яна скаці́лася з яго на родную цёплую зямлю гарачай слязой, каб ніколі больш не расставацца.

1. Як працавала Кропелька? Куды паклікаў Кропельку Паўночны Вецер?
2. Як вы думаеце, чаго чакала Кропелька? Якую краіну яна ўбачыла?
3. Чаму Кропелька не магла дачакацца, калі прызямліцца бярозавы лісцік?
4. Ці спачувалі вы Кропельцы? У які момант хваляваліся за яе? Радаваліся?
5. Знайдзіце сказ з выразам «халоднае сонца». Чаму аўтар назваў сонца халодным?
6. Прачытайце твор. Падзяліце яго на часткі па плане. Перакажыце твор у групах.

П л а н

1. Кропелька працуе ў родным краі.
2. Кропелька пакідае родны кут.
3. Кропелька ў далёкім краі.
4. Вяртанне Кропелькі на родную зямлю.

Якія яшчэ малюнкі можна зрабіць да гэтага твора. Раскажыце. Прыдумайце працяг твора.

Правообладатель Национальный институт образования